Іван Лагвіновіч



# ПІЛІПАЎКА

**Іван Лагвіновіч**

# Кот Маркіз

**Вершы**

## Парнас

Заўсёды напашэве
папера й самапіска -
запісваць нашаптаныя
Музаю радкі.
Парнас - гара крутая,
з вяршыняю няблізкай.
І кожны верш - прыступка.
Нямала мне такіх
прыступак трэба ўзвесці,
каб апынуцца ў храме
прыгожага пісьменства
між выбітных майстроў
дасведчаным паэтам
і надпіс, хоць на браме,
пакінуць для нашчадкаў:
«І я спазнаў любоў!»

## На Дзяды

Сёння ўвечары я
да суседкі - ўдавы не пайду,
рук сваіх ёй на плечы
даверліва не пакладу,
пра надзённыя справы
гаворкі з ёй не павяду -
сёння ўвечары.

Сёння ўвечары я
і сваю, і чужую бяду
ад дзвярэй і ад вокан,
ад лёсаў далей адвяду,
закапаю ў бары,
над балотам развею нуду -
сёння ўвечары.

Сёння ўвечары я
спажываць буду толькі ваду,
сорак сёмага года
згадаю ратуй-лебяду,
і гарбатага старца,
і ў пальцах ягоных дуду -
сёння ўвечары.

Сёння ўвечары я
помнік даўнім гадам узвяду
каля светлага гаю,
у новых дарог на віду,
не з граніту, не з бронзы,
а з чыстага золата дум -
сёння ўвечары.

**Настальгічная навэла**

Далёка ад пакінутай радзімы
я часта ўспамінаю шэры камень,
што ў сонцалюбным разнатраўі луга
ў дзірван урос амаль напалавіну.

Даўно-даўно - шасцігадовы, босы -
за матыльком стракатым я пагнаўся -
аб камень той знячэўку спатыкнуўся...
Вялікі палец правае нагі параніў
і не адзін прымяты дзьмухавец
сваёй крывёю перафарбаваў.

Паплакаў я, размазваючы слёзы,
і пакульгаў наўпрост да агнявішча:
гаючым попелам пасыпаў ранку,
лістком трыпутніку «забінтаваў».

Боль спакваля аціх, утаймаваўся.
Вярнуўся я на месца «катастрофы»,
каб пакараць занадта цвёрды камень.
Яго хацеў я неадкладна вырваць,
адтраляваць да «чортавага вока»,
шпурнуць у пашчу каўкаючай прорвы.
Але не змог: не для малога справа.

Цяпер, з майго маркотнага далёка,
тойваспаваты, кляты шэры камень
здаецца светлаю вяршыняю сусвету,
скалою сутыкнення ў настальгіі.

**Жураўлі над Крымскімі гарамі**

На світанку туман
адпаўзае па кручы скалы
да зялёных яшчэ,

да ўраселых пагоркаў малых.
Не ўзлятайце пакуль што,
пабаўцеся ў гнёздах, арлы!

- Курлы-ы...

Спеў тужлівы з Палесся
па хвалях высокіх прыплыў.
За сустрэчу п'ю водар
сасновай ігліцы й смалы.
Майце гонар і годнасць -
замрыце, знямейце, арлы!

- Курлы.

Ранак золкі, пахмурны,
а ў сэрцы - лагоды святлынь!
Надыходзячы дзень
вершаванае варты хвалы.
Што ж, раўнуйце мяне
да братоў выраёвых, арлы!

- Курлы!
- Курлы.
- Курлы-ы...

* * *

Забытую сцежку трава заплятае,
зямля паглынае з расою сляды,
а памяці нашай сцяжынка святая
пазбегла такое бяды.

Пачуеш, бывае, шчымлівую песню,
што маці спявала табе перад сном,-
праменьчыкам ясным праляжа да весніц,
да грушы старой пад вакном.

На вуснах асмяглых уквеціцца ўсмешка,
адступіцца нэндза ад сэрца твайго...
Пакуль аднаўляецца памяці сцежка,
ты ў свеце яшчэ не ізгой!

* * *

Страла журбы ў душу пацэліла -
сышоў з яе бадзяжны дух.
Дзяцінства выспа ссірацелая,
я да цябе здалёк іду.

Надоўга ў чорны дзень расстаўшыся
з табой - ахвярнай, дарагой,-
не меў я пэўнага прыстанішча,
радзімы не шукаў другой.

З дарогі гонару і годнасці
не збочыў па чужых слядах.
Я памятаў пра повязь роднасці,
калі духоўна галадаў.

**Украіне**

Прабач, а дакладней,
даруй, Украіна:
я быў толькі госцем
удзячным тваім.
Не стаў і за трыццаць гадоў
родным сынам,-
мне Бог не дазволіў
душу раздваіць.

Шаўчэнка, Рудански,
Васыль Сыманенка -
сыны плоць ад плоці
і кроў ад крыві -
цябе называлі наўздых
«наша нэнька».
Я права такога
не меў, дрыгавіч.

Плыве да вытокаў Дняпра
мая лодка,
сваё ўсё з сабой
на Радзіму бяру.
Была ты гасціннаю,
добраю цёткай:
сястра табе -
маці мая Беларусь!

* * *

Апуджаны, аблуджаны, адпеты -
бадзяўся доўга на чужой зямлі...
Міналі зімы, адцвіталі леты,
да мораў рэкі скіфскія цяклі.

Давалі працу шахты і заводы,
каб грошы меў на хлеб і на віно,
а неба - зорачкі на ўзнагароды:
усе, што зіхацелі нада мной.

Хадзіў на сходы і ў далоні пляскаў,
прамоўцаў выклікаючы на «біс»...
Я быў наіўны: верыў іхнім казкам
пра светлы ўсеагульны камунізм.

Фінал трагічны вежы вавілонскай
нанова паўтарыў дваццаты век:
імперска-бальшавіцкія абломкі
балюча б'юць мяне па галаве.

**Калодзеж**

Дзе ў дзяцінстве града
палымнела квітнечюым макам,
дзе начамі ў гаі
птаству спаць не даваў салавей,-
я аднойчы завыю
здзічэлым, зваўчэлым сабакам:
не да зораў высокіх -
да росаў на ніцай траве.

Войкне сонны крумкач,
адгукнецца кулік на балоце;
сцепануцца дубы -
і заўчасна ўпадуць жалуды.
Бо ўздрыгнецца зямля!..
Занядбаны, спрагнелы калодзеж
шэптам ямных раслін,
мне падасца, папросіць вады.

Вып'ю з пляшкі віно
і пайду да лясное крыніцы -
нацянькі, праз былыя
падворкі, прысады, палі.

Прынясу я калодзежу
чыстай, халоднай вадзіцы,-
ён семнаццаць гадоў
мяне шчодра калісьці паіў.

* * *

Падчас начных шалёных завірух
пагрэцца зойдуць да мяне ў кватэру
знянацку, у ваўчыную пару,
азяблыя ў нябыце касінеры -
тутэйшага павета мужыкі,
паўстанняў невядомыя героі.
Яны параспранаюць кажухі,
пастаўяць у перадпакоі зброю.
За стол гасцей шаноўных пасаджу,
у невялічкай, але ўтульнай зале,
за кубачкам гарбаты папрашу,
каб пра жыццё Багрыма расказалі.

**З няволі**

Далей ад варожага
вока і неба,
праз зараснікі
тумановў і дажджоў,
да цёплае хаты,
да смачнага хлеба,
да добрае маці
цярпліва ішоў.

Адмераў нямала
крутых кіламетраў,
бо селішчы ўсе
абмінаў і палі.
І толькі ў кашчэевай
пушчавай нетры
паходню дазволіў
сабе запаліць.

Блукаў у начных
сутарэннях прагалін,
упасці баяўся,
бо мог і не ўстаць.
Пякучыя пырскі

з паходні сігалі,
шалёнымі восамі
джалілі ў пясць.

На ўзлессі спыніўся
і вочы прымружыў,
але не ад болю
ў расцёртай назе,-
яму падалося,
чароўную ружу
як знак вызвалення
з палону нясе.

**Пакінуты край**

З усходніх лясоў
за мяжу вербалозаў,
на колішні луг
у струхлелых стагах
сунічны світанак
пушчанскія лосі
зноў вынесуць на
галінастых рагах.

Відушчымі стануць
крыніцы і кветкі,
пачнуць прыбірацца
казюлькі ў траве.
І толькі не выйдзе
дагледжваць палеткі -
каторы ўжо год! -
гаспадар чалавек.

Нявольнік шлагбаўм
ля дарожнага знака
«руку» з ланцугом
не падыме ўгару.
Скавыча галодны
прыблудны сабака
і з ліпы няўсмак
абгрызае кару.

## Просьба

Па лагчынах і выспах
з кіёчкам няспешна іду.
Я не абмежаваны
ў прасторы вандроўкі і ў часе.
Ваша светласць бяроза
і ваша высокасць дуб,
ваша міласць асіна
і яснавяльможнасць ясень -
паважаныя дрэвы!
Сякеры на вас не вастру,-
стаіце вы аховай
зямлі гэтай годна на варце.
У мяне да вас просьба такая:
калі я памру,
над моёю магілай
БЕЛАРУСКІЯ песні спявайце.

## Насланнё

У галаве гудуць званы
хваробы нейкай невядомай,
я прыхінуся да сцяны
чужога гмашыстага дома.

Да траў асунуся плюшчом,
карчом на кукішкі прысяду.
Хай пакладзе мне на плячо
руку спагады куст прысадаў.

Заплюшчу вочы, абхаплю
напампаваны болем чэрап,
над скроняй жылачку злаўлю,
націсну - можа, палягчэе.

Нягожа мне тут паміраць:
я ж не бязродны, не бяздомны.
...Даўмеўся рыфмы падбіраць -
і вытрываў, не знепрытомнеў.

**Гаротнік маліўся**

Госпадзе!
Я не знаю, дзе ночы, дзе дні.
Я ўзрыўны, бы набой у агні.
Выспу роспачы не абміні -
заслані мяне, абарані.
На зямлю, дзе мае карані,
жыватворнай спагады ліні.
Да глыбокіх духоўных крыніц,
да высокіх званіц навярні.
Каб я ведаў, дзе ночы, дзе дні,
уратуй, не шкадуй дабрыні.
Амін.

**Музе**

Шмат разоў заракаўся
цябе не любіць
і сябе пераконваў,
што ты - не ад Бога,
нат намерваўся
злога сабаку купіць,
каб адпуджваў - брахаў,
не пускаў да парога.

Сам сабе арыштант,
ад вакна да дзвярэй
скульгавелай хадою
пакой перамерваў.
Білі ў такт маім крокам
то ямб, то харэй
па разбэрсаных струнах
разладжаных нерваў.

Вінаваціў сябе:
не па-людску жыву,
дазваляю душы
аддаляцца ад цела.
Сарамаціў цябе:
на маю галаву
не лаўровы вянок -
палыновы надзела.

А калі творчы крызіс
схіляўся на спад,

адлятала ў былое
дэпрэсіі сцюжа,-
даравання прасіў,
уславўляў, асыпаў
залатымі пялёсткамі
сонечных ружаў.

**Юдольны дыпціх**

У манастыр зрэнак тваіх
у плашчы з трох ружаў
іду паміраць.
Валера Ігнаценка

1

З палону трывогі
іду да цябе.
Знябыты, убогі -
іду да цябе.
Не бачу дарогі -
іду да цябе.
Скрываўлены ногі -
іду да цябе.

З вясновага ранка -
ці бачыш мяне?
З ляснога паўстанка -
ці бачыш мяне?
З высокага ганка -
ці бачыш мяне?
Душа мая ў ранках -
ці прымеш мяне?

2

Скажы - і я пачую,
бо ўсе цяпер маўчаць.
Прыйду, пераначую
каля твайго пляча,
каля твайго дыхання
і думак пра мяне...
Спагаднае адхланне
знайду ў ахоўным сне.

## Дудар іграў

Адгадуй валасы да пояса,
падзялі на тры часткі роўныя,
запляці парой сенакоснаю
разам з промнямі сонца яснага
і касою той, што не клеплецца
і не вострыцца, бо не тупіцца,
пакасі на палетку ростані
пустазелле маёй журбы.

## Мроя

Ноч уздыхне
аўдавелай сялянкаю
ў траў прахалодзе.
Блісне
сярэбранаю завушніцай
ветах у росах.
З брамы ўспамінаў
выйдзе дзяўчына
з русай касою -
даўнім спатканнем,
першым каханнем,
вабным змяркаем.
Я пасігналю
промнем надзеі,
сумам аклікну.
Не азірнецца
і не азвецца...
Пойдзе на хутар.

## Трыадзінства

Я марыў
аб узнёслай, беззаганнай,
прачыстай,
як эдэмская раса,-
і мне адкрыўся ў храме
лік жаданай
на цьмяных
старадаўніх абразах.

Зарою велікоднай
німб свяціўся.

Я бачыў
у адной асобе - тры:
яна ж бо ўвасабляе
трыадзінства
жанчыны -
маці, жонкі і сястры.

Сплывалі ў Лету
туманы падману,
нявер'я
расступаліся лясы...
- Маім будзь сынам,
мужам, братам Янам
ад сённяшняга дня -
на ўсе часы!

Марыю-маці
і Марыну-жонку,
сястру Марысю
ў веры вызнаю.
Я давяраю ім
жыцця скарбонку -
душу
паспавяданую маю.

**Чытаючы эпіфаніі Іманта Зіядоніса**

Гэты свет мы з табою
для шчасця стварылі
і яшчэ памятаем,
дзе лінія старту.
Нашу Трою знябытаю
мы адрадзілі
і забытаю Спарту.

Твае грудзі, жанчына,
у маку чырвоным,
у зубах у мяне
васілёк сіні-сіні...
Выспяваюць магутныя
ў кронах зялёных
жыватворныя сілы.

Не віхурыцца пыл,
нашы ногі не вязнуць,
і не цяжка з дарогі

адкідваць каменне.
Мілатою ўсячыстаю
льецца на вязы
залатое праменне.

Дай мне з сонечным маслам
надзённага хлеба:
мабыць людзі ўжо выйшлі,
і нам не спазніцца б...
Да радзіннага поля
кліча жаўранак з неба,
з прыдарожжа - сініца.

Салаўінага хлеба дай
з сонечным маслам,
бо ён дабраславёны
бярозай і вішняй.
Прыпынемся, пастойма
над расінкай нязгаслай,
над слязою ўсявышняй.

Пасля ночы купальскае
дзень будзе Янаў;
мы павінны пакінуць
сляды нашы ў полі,
каб ні жыта, ні бульбы
не кранула загана
аніколі-ніколі!

Я задумлівы сёння,
маўклівы, прабач мне,
не сказаў, дзе мы з братам
учора касілі,-
у зубах у мяне,
ты ж сама гэта бачыш,
васілёк сіні-сіні.

**Вянкі пакаяння**

З вытокаў таямнічых
язычніцкае даўніны
плывуць вянкі купальскія...

Па зрэнкавых паазер'ях,
па сэрцавых паартэр'ях -
рамонкавыя, васільковыя...

Праз каталіцтва і праваслаўе,
праз уніяцтва і пратэстанцтва
дрыгавіцка-крывіцка-радзіміцкае...

Да Галгофы ерусалімскае,
укрыжаванаму Хрысту,
заміж таго, пакутніцкага,
з церняў.

**Ян Прадвеснік**

На пятнаццатым годзе
праўлення Тыберыя ў Рыме,
калі Понцій Пілат
над Юдэяй начальнікам быў,
а зняслаўлены Ірад -
тэтрархам зямлі Галілейскай,
голас Божы ў пустыні
пачуў, памаліўшыся, Ян.

І пайшоў па абжытых здавён
наваколлях Ярдана,
прапаведаваў існасць
святога хрышчэння вадой:
- Гэта Богам ухвалены
чысты абрад пакаяння
на высокую міласць
і на адпушчэнне грахоў;

як напісана ў кнізе
святога прарока Ісаі:
«Азначацьме той голас,
што будзе ў пустыні гучаць:
падрыхтуйце шлях Госпаду,
сцежкі прамымі зрабіце;
хай нізіны напоўняцца
цвердзю паніжаных гор;

павыпростваюцца
хай усе к таму часу крывізны;
і дарогі няроўныя
гладкімі стануць паўсюль;
і хай кожная плоць -
на зямлі, у вадзе, у паветры -
бачыць і суцяшаецца:

Божы ратунак прыйшоў!»

Абуджаліся людзі
ў Віфаніі і Ерыхоне...
Ян Хрысціцель казаў:
- О выроддзе яхідніна! Хто
уцякаць вас намовіў
ад будучай кары нябёсаў?
Прынясіце ж плады,
годныя пакаяння свайго.

І не думайце самі
сабе гаварыць: «У нас бацька
Абрагам»; бо кажу вам,
што Бог з камянёў гэтых во
можа, колькі захоча,
узвесці дзяцей Абрагаму
і хлябоў напячы,
каб усіх іх затым накарміць.

Вунь сякера ляжыць,
паглядзіце, пры корані дрэва;
і лісточкі на ім,
прадчуваючы драму, трымцяць;
усялякае дрэва,
што добрага плоду не родзіць,
пры нагодзе ссякаюць,
кідаюць затым у агонь.

І звярталіся людзі:
- Скажы, што рабіць нам, Настаўнік?
Ён казаў у адказ:
- У каго ёсць адзежыны дзве,
дай таму, хто зусім
абнасіўся, не мае ніводнай;
гэтаксама і з ежай
зрабі, у каго яна ёсць.

Ён хрысціў пастухоў,
вінаградараў, мытнікаў, вояў...
На пытанне: «Рабіць што?»
даваў адназначны адказ:
- Больш таго, што павінна
належаць паводле законаў,
не бяры, задаволены
платай заробнаю будзь.

У чаканні жыў люд;
і ўсе думалі ў сэрцах пра Яна:
«А ці ён не Хрыстос,
Усявышняга любасны Сын?»
Ян адказваў усім:
- Я - прадвеснік. Хрышчу вас вадою.
Той, Каго вы чакаеце,
будзе мацнейшы шматкроць!

На Ягоным абутку
неварты я рэмень аслабіць,
альбо выцерці пыл
чыстым краем адзення свайго.
Падрыхтуйцеся добра,
прызначаны час не праспіце,
бо Ён прыйдзе хрысціць вас
і Духам Святым і агнём.

У Ягонай руцэ -
беззаганная веялка-шуфель;
ён ачысціць гумно
і ў засекі пшаніцу збярэ,
а салому і высеўкі
спаліць агнём непагасным,
каб прасторна і светла
ў Гасподняй гасподзе было.

Шмат чаго яшчэ іншага
Ян звеставаў прынародна,
павучаў, наварочваў
да Бога сваіх слухачоў...
Але Ірад-тэтрарх,
дакараны за Ірадыяду,
жонку брата свайго,
у цямніцу прарока ўвязніў.

А калі ахрысціўся
народ і Ісус ахрысціўся,
адчынілася неба -
сышоў Дух Святы на Яго.
І быў Голас з нябёсаў,
які правамоцна прамовіў:
- Ты - Мой любасны Сын:
Я Цябе на зямлі ўпадабаў!

**Нагорная пропаведзь Ісуса Хрыста**

Дабрашчасныя ўбогія духам:
царства Божае ваша, і вам
херувімскую музыку слухаць
у садах, дзе не вяне трава.

Дабрашчасныя, хто сёння плача,
не хаваючы смутку свайго:
вам дазволена Богам убачыць
светач радасці ў царстве Яго.

Дабрашчасныя, хто быў галодны,
хто цярпеў на шляху да Мяне:
вы ўжо выйшлі з пустыні бясплоднай
і не будзеце болей прагнець.

Дабрашчасныя вы, калі людзі
вас адлучаць, і ваша імя
беспадстаўна зняслаўлена будзе,
і прычынай таго буду Я.

Весяліцеся з гэткай нагоды,
гэты дзень абвясціце святым,
бо вялікай цаны ўзнагарода
будзе вам на нябёсах тады!

Гора вам, хто з набітай кішэняй
месца ў раі купіць намысляў!
Атрымалі вы ўжо суцяшэнне,
незайздросны наперадзе шлях...

Не бясконца вяровачка ўецца:
голад вылічыць, сытыыя, вас;
і заплача, хто зараз смяецца,
загалосіць, хто сёння спяваў.

Гора вам, калі ўсе будуць людзі
толькі добра пра вас гаварыць:
бо ілжывых пракрокаў не судзяць,
цень ад дрэва ў агні не гарыць.

Сапраўды вам кажу: палюбіце
вашых ворагаў, напаснікоў;
ненавіснікам ласку рабіце,
прывячайце іх як сваякоў.

Кляцьбітоў вашых дабраслаўляйце,
каб пранікліся ў сэрцах віной;
і другую шчаку падстаўляйце,
калі ўперылі ўжо па адной.

Той, хто верхнюю вопратку вашу
адабраў у вас, хай забярэ
і кашулю,- Бог верне прапажу,
вас у шоўк, аксаміт убярэ.

Тое самае людзям рабіце,
што хацелі б ад іх атрымаць;
хто не любіць вас, тых палюбіце
і чыніце дабро задарма.

Міласэрнымі, чулымі будзьце,
як і ваш міласэрны Айцец;
асуджаць і судзіць не спрабуйце,-
рэхам тое ж на вас упадзе.

Дабрачыньце заўжды, пазычайце -
у пару пасяўной і жніва;
поўнай мераю людзям давайце -
гэтаксама адмерыцца й вам.

Бо калі пойдуць двое з кіямі,
і сляпога сляпы павядзе,-
у бліжэйшую, першую ж яму
хіба толькі адзін упадзе?

І вышэй за настаўніка вучань
не сягне; лепшы вынік для іх:
той, хто вучыць, і той, каго вучаць,
стануць роўнымі ў ведах сваіх.

Што глядзіш ты ўсё на парушынку
ў воку брата свайго? А між тым
не заўважыў калоды аршыннай
у прыдзірлівым воку сваім.

Як ты можаш сказаць твайму брату:
«Браце, дай выму з вока твайго
парушынку», калі ты не бачыш,
як зручней падысці да яго?

Крывадушнік! Спярша ты калоду
вымі з вока свайго і тады,

калі зрок твой адчуе свабоду,
выручай вока брата з бяды.

Няма добрага дрэва, якое б
плод радзіла нікчэмны, благі,
як не можа даць дрэва благое
добры плод, чысцінёй дарагі.

Пазнаецца з пладовага соку
дрэва ўсякае; людзі пакуль
не збіраюць з цярноўніку смокваў,
вінаграду - з кустоў хмызняку.

Людзі добрыя з добрага скарбу
сваіх сэрцаў спаўна аддаюць,
а ліхія - на просьбу і скаргу -
нават з лішніцы вам не нальюць.

Што вы клічаце: «Госпадзе Божа!»
і не робіце, што Я кажу?
Хто яшчэ перайсці вам паможа
між грахом і збавеннем мяжу?

Кожны, хто Мае словы ўспрымае
слыхам розуму, слыхам душы
і ў учынкі іх увасабляе,
будзе ў царстве Ўсявышняга жыць;

бо падобны ён на чалавека,
што надоўга свой дом збудаваў:
паглыбіўся да цвердзі спрадвечнай,
на граніце падмурак заклаў.

А хто слухае так, для парадку
і трымае душу на замку,
той нагадвае нам небараку,
што будуе свой дом на пяску.

Напаследак сказаць вам хачу Я,
каб на гэтым закончыць урок:
кожны, хто мае вушы, хай чуе,
і хай бачыць, каму Бог даў зрок!

**Пакараныя**

Я з рук братоў атруту п'ю,
аднак шкадую іх, люблю.
Спяліць у сэрцы крыўду, гнеў
Хрыстос не дазваляе мне;
бо пакараных не караюць:
не ведаюць, што вытвараюць.

**Вяшчун прарочыў**

Надыдзе час
пакаяння твайго,
калі прыйдзеш ты
да малельні тваёй,
пакорна ўпадзеш
на калені тваe
і будзеш на мове
продкаў тваіх
маліцца Госпаду,
Збаўцы твайму,
паверыўшы, што
Ён пачуе цябе.

**Бязвольныя**

- У які бок, тумане,
адправішся сёння «ў паход»:
да Мышанкі, на захад
ці, можа, да Шчары, на ўсход?

- Куды вецер павее,
туды па расе й паплыву:
я бязвольны, бы людзі,
што ў селішчах гэтых жывуць.

**Гнаны**

Не мог ён успомніць,
калі еў і што еў,
за стойкай буфетнай
ці дзе за сталом.
Даўно ўжо не спаў
пад аховаю столі,

сагрэты спагадным
сямейным цяплом.

Цікаўныя людцы
пыталіся: - Хто ты?
І ён ім адказваў:
- Я - той, хто ідзе
з Адтуль у Туды,
да прыснёнага Потым;
там брат будзе братам
і днём будзе дзень.

Бабулькі пабожныя
дрогкія вейкі
тым часам аброшвалі
кроплямі слёз:
- Прыгожы мужчына,
сярэдняга веку,
а, бач ты, пакрыўдзіў,
гаротнага, лёс.

Ніхто не выносіў
і чэрствай скарынкі,
не кажучы ўжо,
каб у дом запрасіць.
Пыталіся дзеці:
- Чаму без катрынкі?
Пацвельваліся:
- Можа, дулю з'ясі?

На сценах дамоў,
на дзвярах магазінаў
ён бачыў абвесткі
з партрэтам сваім:
«Прытворшчык,
агент агрэсіўнай краіны.
Загад: зняважаць,
не карміць, не паіць!»

Не клянчыў, не кляўся,
б'ючы сабе ў грудзі,
што ён ім не вораг,
не здраднік, не кат,
бо ведаў з маленства:
тутэйшыя людзі
прывучаны строга
выконваць загад.

Абы дагадзіць,
яны ўтвораць пустыню
на месцы, дзе ўславіўся
памятны дуб,
зруйнуюць магілы,
панішчаць святыні,
да шыбеніц
крэўных сваіх павядуць.

**Ля Вечнага агню**

*Дзе смутак, там дол святы.*
***Оскар Уайлд***

Жалобныя ніціыя вербы:
дзве - злева, дзве - справа.
Між імі нявянучай кветкай -
агонь непагасны,
прыхільнік адзінае веры,
агульнае славы,
падзеяў нязмушаны сведка -
былых і сучасных.

Праз дрогкае полымя бачу
паходні пагоняў,
крывавыя, дымныя зоры
знябытых хатыняў.
Бязгучна, бясслёзна паплачу...
у смутку ў палоне.
Жар-попел пакутнае зоны
не хутка астыне.

**Схамяніся**

Сястра русявая, блакітнавокая,
як цвёрда гэкаеш, акругла окаеш.
Была Марыськаю, цяпер - Марусечка,
зманкуртаваная ты беларусачка.
Не асмялелая, а знахабнелая:
з галубкі вырасла варона белая.
Сябе ўважаеш ты дачкой імперыі,
маскоўскай меркаю, а ў Менску мераеш.
Глядзі, каб марачы аб райскім кветніку,
не апынулася, пардон,на сметніку.

**Вяселле**

Сабрала сваякоў
у гурт вяселле:
забавы-жарты,
спевы, гамана...
Хапае ўсім
наедку і віна;
запойным -
застанецца й на пахмелле.

Самотны, аглавушаны -
маўчу я:
гармідар да душы
не дастае.
З іх вуснаў
родных песень не пачую,
хоць тут браты,
пляменнікі мае.

Як цяжка
заставацца беларусам,
быць за сталом
чужым сярод сваіх!..
Пакіну дом,
па вуліцы прайдуся,-
навошта ім журба
вачэй маіх!

**Пад вузкай коўдрай**

Паехаў сын, а маці засталася
плаціць зямлі сялянскія даўгі.
Рака тугі-маркоты разлілася,
спакою затапіла берагі.

Альбом з дзесяткам картак пагартае -
згадае незваротныя часы.
Яна не спадзяецца на вяртанне,-
не першы з'ехаў з вёскі яе сын.

Нікога з іх не стане вінаваціць,-
«шукае рыба месца, дзе глыбей...»
У родных хатах холадна ўжо спаць ім,
бо горад цягне коўдру на сябе.

**Заклік**

Трубадуры, дзьміце ў трубы,
марш Свабоды выдзімайце!
Цішыня пакоры - згуба.
Памятайце: вы - на варце!

Абуджайце край знямелы
ад зямлі да паднябесся.
Хай над бел-чырвона-белым
сцягам
акрыяе песня -
сэрцу мілая, як бусел,
як валошка ў спелым жыце.

Трубадуры Беларусі,
дух змагарны пакажыце!

**Пакліканыя**

Да крывавых разораў
мы не сцішым язды.
У пагоні кірунак
і хуткасць нязменныя.
На крывавых загонах
нашых продкаў сляды,
каб нашчадкі знайшлі,
крамянямі ўкаменены.

Шлях наш дабраславёны
сівізной курганоў.
Мы пакліканыя
не забавамі цешыцца:
ад крывавых разораў
адшугнем груганоў,-
ля крывавых загонаў -
буслінае гнездзішча!

* * *

Сасуды крывяносныя
звужаюцца,
азяблых рук
і ў спёку не сагрэць.
Апошні дзень

імкліва набліжаецца:
пара падумаць,
грэшнаму, пра смерць.

Даруй мне, неба,
што так часта божкаю,-
не проста
рэчаіснасць успрымаць:
ёсць могілкі
і рускія, і польскія,
а беларускіх,
для мяне, няма.

**Піліпаўка**

Змяркаю восеньскім змяркannем...
Туман сівое барады
найбольш пасуе да гукання
аснежанае Каляды.

У спевах ветравае дудкі -
слаты піліпаўскае ўсхліп.
Піліпаўскія сненні, думкі...
Дарэчы, бацька мой - Піліп.

* * *

Паваенны год пазык, падаткаў,
час выпрабаванняў і надзей...
Нагавіцы зрэбныя, у латках,
зняў і я - картовыя надзеў.

Крэкчучы пад цяжкім вокам культа,
шчодра галасуючы за мір,
працаўнік, з адной рукой і кульцяй,
адзяваў малых нас і карміў.

**Былы кумір**

- ...Будзеш есці? - зноў перапытаў.-
Халадзільнік тут не без патрэбы.
Я зямлю дарэмна не таптаў:
сёе-тое маю і да хлеба.-

Ён маўчыць, праз шыбіну глядзіць
на ката, што абдымае ліпку.
- Ад падворка погляд адвядзі,
а то вочы да вакна прыліпнуць.-

Ні брывом, ні вухам не павёў,
толькі неяк крыва пасміхнуўся.
Па прасёлку адмахаў пяць вёрст,
сеў за стол - нібыта ў вір кульнуўся.

Утрапёны, згорблены, худы...
- Трэба есці - рай жыццё ці пекла.
- Мне б саракаградуснай «вады» -
кроў па жылах весялей пабегла б.

Наліваю. Сем гадоў таму
ён не ведаў гэткае «хваробы»,
я зайздросціў хораша яму,
быць імкнуўся на яго падобным.

* * *

Не радуе сэрцы
бязладнае сёння,
былое саромеемся
ўспамінаць...
Падковы каню,
што на гербе «Пагоня»,
даўмецца павінны
сыны памяняць.

* * *

Зноў захочацца сэрцу
абдымкаў раздолля
ў пекны час даспявання
чарніц і ажын...
Запрасі адпачыць
да жытнёвага поля,
на гасцінны дыван
васільковай мяжы.

Супакояць душу
твой суцешлівы голас,
дрыгавіцкая песня

пра край дарагі.
Заміж свечкі вазьмі
арэолісты колас,
адпусці мае ўсе
гарадскія грахі.

**За аселіцай**

Тут такая прыгажосць:
ёсць дзе Богу памаліцца!
Анатоль Станкевіч

На вуснах кветак
радасныя ўсмешкі -
зіхоткім ззяннем
ранішняй расы.
Згінаючы сцябліны,
каласы
ў паклонах нізкіх
хіляцца да сцежкі.

Два жаўранкі,
абраннікі блакіту,
агучылі
мембраны цішыні;
іх дыялог
узгоднена звініць
хвалою
палявому дабрабыту.

Казаў мой сябар:
- Ёсць дзе памаліцца!
А ён адкрыта
ў гэтым краі жыў,
каб мог слых сэрца
ў гуках узмацніцца
і абастрыцца ў ззянні
зрок душы.

**Кпіны вечназялёнае яліны**

I
дуб
стары
замшэлы

ганарыцца,
фанабэрыцца,
як да пачатку
чэрвеня апер'іцца:
я
дам
адпор
дажджам,
маланкам і вятрам!

**Урок роднае мовы**

Вокны - вокі яны.
Вакно - вока яно.
Літара «в»
узначальваць павінна слова,
калі вокан многа
і калі вакно адно.

**Рамантыка**

Абжыты кут
здаецца сумным лядам.
Пакратаць трэба,
што ляжыць далей.
Жаданне
зазірнуць за далягляды
дапытлівым
спакою не дае.

Даверышся
заснежаным прасторам,
у гурбах загрузаючы,
ідзеш,
не ведаеш,
да шчасця ці да гора
на гэты раз
сцяжынку пракладзеш.

**Дарагое**

Пейзаж з бярозамі і соснамі;
у самым цэнтры - волат дуб.
Да ранаў сэрца прыкладу

пейзаж з бярозамі і соснамі.
Здарожанаму, стане млосна мне,
як на тым месцы не знайду
пейзаж з бярозамі і соснамі,
дзе ў цэнтры - храмам волат дуб.

* * *

Назбіраю я лісцяў апалых
на пляцоўцы шырокага пня,
дзе дажджынкі нага не ступала
з учарашняга хмарнага дня.

Прынясу далікатна дадому,
раскладу на пісьмовым стале.
Мне - самотнаму, немаладому -
будзе з імі цяплей і святлей.

А як люты над выстылым полем
зашмаргне завірухі пятлю,-
адпушчу іх праз фортку на волю,
дням вясны запрашэнні пашлю.

**Элегія**

Была ідылія,
цяпер - элегія:
зямля настылая,
трава палеглая;
раз-пораз шамкае
грудок бляшанкамі;
вятры халодныя,
заўжды галодныя
з бяроз бязлітасна
згрызаюць лісцейка;
на чорным ворыве
балююць вораны.
Канец кастрычніка -
і верш без клічнікаў.

**Аўтограф**
**шахцёрскі жарт**

Дух глыбіняў, дазорац забояў
першабытным каменным пяром
на баку, адчувальным да болю,
распісаўся - аж скуру ўспароў.

Хай адзначыць мажлівы біёграф,
як захоча пісаць пра мяне:
знак на целе насіў я - аўтограф
продка-прашчура, што скамянеў.

**Пенсіянер разважаў**

Купіў бы я новенькі веласіпед,
каб з кожнае пенсіі
дзесяць адсоткаў
употай ад сына й дачкі
«адтасоўваў»
і ў касе ашчаднай
хаваў для сябе.

Ужо падлічыў:
за чатыры гады
набралася б грошай
патрэбная сума.
Да рэчкі Мышанкі
з суседам і з кумам
Я ездзіў бы на выхадныя тады.

Рыбалка, на ўлонні прыроды абед,
да юшкі - гароднiна
з кумавай дачы...
Каб дзеці не бралі
ў мяне без аддачы,
купіў бы я новенькі веласіпед!

**Парасткі**

1

Бы птушку з клеткі -
выпусціў з абдымкаў...
Паабяцала:
- Я сюды вярнуся!
На ростані,
чакаючы яе,

я зразумеў:
свет сумны без жанчыны.

2

Я быў аглух
да спеваў салаўя,
аслеп да квецені
чаромхі, бэзу:
не прыляцелі
з выраю буслы -
і для мяне
вясна не наступіла.

3

Цячэ рака,
шапоча асака,
мярэжай-хмарай
неба ловіць рыбу.
Старая дуплаватая
вярба
санліваю бабуляй
пазяхае.

4

Нічога не пісаў
і не чытаў,
не дакранаўся
да прыладаў працы.
Дзень змарнаваны
ў дзённіку жыцця
нулём з вялікім клічнікам
пазначыў.

**Дровы**

Вось алешнік сухі на дровы:
без галін, дзе-нідзе - сукі.
Вецер-дзьмух павышчыкваў бровы,
зух мароз агаліў бакі.

Эх, сякера - стальная вера,
загартоўкі крутой лязо!
Па камлі з усёй сілы ўперыў -

верхавіна аж пяць разоў

сцепанулася, і апошні
ад яе адламаўся сук.
Да заснежанай роўнай пожні
паскакаў змерзлым рэхам стук.

Сёння мне завіхацца трэба,
бо ў сяле, як ні варажы,
хоць і маеш кумпяк да хлеба,
не пражыць без дроў, не пражыць.

**Раніца**

Азваліся трэці раз
пеўні з-пад дахаў.
Пудлівы туман
уцякае на захад,
бо сонца ўзышло,
вышыню набірае,
на кожны падворак
праз плот зазірае.
Травінкі,
з сябе абтрусіўшы расінкі,
ужо распрамляюць
і шыйкі, і спінкі.
Зеніт дапрадае
ў бязветрані яснай
дымоў каміновых
апошняе пасма.
І велічна бусел
у неба ўзлятае
анёлам-ахоўнікам
гэтага краю.

**У Малькавічах вечарую**

Звяла вечаровая зара
нечапанай ганарлівай кветкай,
і на плот бляшчаны звон вядра
пасля дойкі выліла суседка.

Пагудзеў да Лунінца цягнік,
пашумеў да Ганцавіч аўтобус.

Месяц, што над селішчам узнік,
нагадаў мне з нашай школы глобус.

**Крыніцы і зоркі**

Калі б я не жыў
сярод мудрых дубоў,
цікавых бяроз на пагорачках,
ніколі б не ўведаў
пра дружбу-любоў
палескіх крыніц і зорачак.

Зямля настывае
ў начных халадах
імжыста-смужыстае восені...
Усхліпвае
ў лісці апалым вада,
хвалюецца, каб хоць не зброснела.

О, як яны ў пушчах,
дубровах, гаях
чакаюць бясхмарнага вечара!..
У кожнай крыніцы
ёсць зорка свая -
адзіная, верная, вечная.

**Птушынае свята**

У рэшаце мама палала
сухія рабенькія семкі.
Дымкамі палова сплывала
на градку пасолі, за сенцы.

Чакалі «прыдворныя» птушкі
ад мамы маёй пачастунку;
яны натапырылі вушкі,
глядзелі ў адным накірунку.

Скакалі, аж вохкалі семкі
на пругкім, рухомым «батуце».
У птушак зіркастыя зрэнкі
паблісквалі кроплямі ртуці.

Нёс тата ў кашы трэскі, стружкі,
спыніўся і праз паўхвілінкі
заўважыў: - Даволі іх гушкаць:

няма ўжо ніводнай пылінкі.

Абгладзіла мама спадніцу,
сказала ўсміхнёнаму тату:
- Сыпну вераб'ям і сініцам,-
і ў птушак няхай будзе свята!

**Першы падснежнік**

На холадзе
лістком мінулагоднім
падснежнік
ахінуўся з галавой,
нібы жаўнер
пад хмарай дажджавой -
ахоўнай
плашч-палаткаю паходнай.

**Бусел над лотаццю**

Жвава падхапілі ручайкі
між куп'я пялёсткі-залацінкі;
памахалі ўслед ім чарацінкі,
пажадалі дасягнуць ракі.

Змыла навальнічная вада
пазалоту лотаці з балота.
Недаўменны бусел доўга лётаў -
зніклую аздобу выглядаў.

* * *

Шчара зноў стала рэчкаю вузенькай,
аціхае вады гамана;
дзьмухаўцоў залацістыя гузікі
да сукенкі прышыла вясна.
То чаромхавы вэлюм, то бэзавы
прымярае, мяняе духі.
Галасамі на стужкі парэзалі
цішыню салаўі-жаніхі.